УДАРИМ ГОРОХОМ КРИТИКИ О СТЕНУ БЮРОКРАТИЗМА !

ПОЗІРК

№ 2 ТРАВЕНЬ 1990

Незалежнае публіцыстычна-гумарыстычнае выданьне

РУБРИКА : В МИРЕ ЖИВОТНЫХ

ЭТО ОЧЕНЬ ХОРОШО

Заведующий идеологическим отделом районной газеты "Заря коммунизма" М. Бумажкин отворил дверь кабинета главного редак тора.

---Вызывали?

--Да. Тут у нас дежурный коррес пондент взял бюллетень. Есть тема -- писать некому. Выручай.

-- Напишем. Что за тема ?

-- Человека убили.

-- Прекрасно. Никогда у нас в районе такой темы не было. Это очень хорошо, что его убили. За мной дело не станет -- напишу. Журналистское расследование проведу. Всё как надо. Хоть какое-то разнообразие. А то всю жизнь про по вышение надоев, передовой опыт, воспитывай этих трудящихся...Задолбала эта туфта. Всё будет о кэй. Руководящую и направляющую роль, конечно, отражу, в духе, так сказать...

-- Ты что, офигел ?-- главный редактор перестал ковыряться в носу и аж подскочил на стуле.--Руководящая и направляющая...убийство? Да ты же про убийство пишешь, какая тут может быть направляющая роль партии ?!

Только зазвонивший внезапно телефон спа бедного Бумажкина, и он тихонько успел выскользнуть из кабинета. А главный редактор ещё долго слушал первого секретаря райкома, бормоча в трубку:"Понял.Сделаем.Хорошо.Как скажете.Будем ждать дальнейших указаний."

Л. Егорбачёв

ПРА МАЁ ДЗЯЦІНСТВА
(занатоўкі бюракрата)

§1.Згодна даведцы №769/34 дзяцінства ў мяне было .

§2.Згодна пастанове №0523/67-С пад час дзяцінства я быў дзіцем.

§3.Працэс майго дзяцінства праходзі непасрэдным чынам у мае дзіцячыя гады.

§4.Мае дзіцячыя гады працякалі ў адпаведнасьці з актам №90854 ад 23.04.

§5.Да пачатку працэсу дзяцінства я прайшоў працэс нараджэньня ў рэкордна кароткі тэрмін з перавыкананьне плану на 126%.Мае бацькі зрабілі мяне з з'эканомленых матар'ялаў.

§6.На жаль, я нарадзіўся ў застойны часы, і працэс нараджэньня праходзі за зачыненымі дзьвярыма. Не было забяспечана шырокай галоснасьці.

§7.У час дзяцінства я выхоўваўся ў духу адданасьці партыі, бо партыя пачала перабудову, яна же і скончыць.

§8. ...(Засакрэчана - Рэд.)

§9.У працэсе дзяцінства я наведваў школу. Тамака я атрымаў "абразаваньне", і зараз умею добра абразіць чалавека.

§10.Шчыра кажучы, былі у мяне і некаторыя асобныя памылкі, ад якіх я рашуча пазбавіўся. Нарадзіўся я з белымі і чорнымі радзімымі плямамі, якія ад усіх хаваў. Зараз я перафарбаваў ў чырвоны колер і усім паказваю іх.

Пётр Іванавіч Балдашкін

ЯК Я СТАЎ КАМСАМОЛЬСКІМ САКРАТАРОМ.

М. Смуга

Справаздачна-выбарчы сход, як заўсёды, праходзіў сумна, час цягнуўся марудна. Палову часу ўжо, мабыць, прамарнавалі, і амаль усе камсамольцы сілелі у дзьве дзіркі, як мага павольней размясьціўшыся ў няўтульных крэслах. Толькі на чацьвёртым радзе, як заўсёды, два гулякі рэзаліся у крыжыкі-нолікі.

Калі старшыня прэзідыюма сказаў, што пераходзім да выбараў сакратара арганізацыі, я сказаў сабе : " Пара! ",- і пабудзіў сваіх хлопцаў-аднагрупнікаў. Я устаў, падышоў да трыбуны, гледзячы зьдзіўленаму старшыне прэзідыюма проста у вочы, і сказаў ў мікрафон : " Прапаную сваю кандыдатуру як альтэрнатыўную." Тым часам мае сябрукі рабілі сваю справу - яны пераходзілі з раду на рад ды будзілі камсамольцаў нашага Інстытуту. Тыя, хто прадраў вочы, зь вялікай цікаўнасьцю глядзелі на мяне.

-- Вось скажыце, калі ласка,- зьвярнуўся я да былога сакратара, свайго цяперашняга канкурэнта,- ці ёсьць ў Вас праграма?

-- Якая ? - ня зразумеў ён.

-- А вось у мяне - ёсьць,- наступаў я. - А ўзяць асабістыя якасьці. У Вас ёсьць якія-небудзь ?

-- Здаецца ёсьць ...

-- Нават ня ведае!- абурайся я.- А ў мяне ёсьць! Усе ведаюць - я вельмі сьціплы чалавек. Самы сьціплы на факульцеце! А які зычлівы - проста жах.

А тут яшчэ падбег да трыбуны сябра мой Алесь :

-- Дазвольце мне сказать. Паколькі рэглямэнт абмежаваны, то адразу ж перайду да заканчэньня. Галоўнае ня ў тым, што ёсьць праграма, ён сьціплы і зычлівы. Галоўнае ў гэткім рэдкім злучэньні такіх якасьцей як зычлівасьць ды сьціпласьць з наяўнасьцю цудоўнай праграмы.

У гэны момант я падаў знак, нябачны дзеля астатніх, Юрасю, які сядзеў ля падрыхтаванае апаратуры і чакаў загаду. Ён уключыў магнітафон...

Што тутака пачалося! Дзікія авацыі, апладысменты, якія Юрась папярэдне запісаў на канцэрце рок-гурта "Металалом", шмат разоў узмацнёныя электронікай ўзарвалі залу. Папрачыналіся і паўскоквалі нават тыя, хто заўсёды спаў на лекцыях. Яны, мабыць, падумалі, што сход скончыўся ды пачалася дыскатэка...

Далей я нічога не памятаю, памятаю толькі як старшыню прэзідыюма забрала "хуткая дапамога".

Вось так я стаў сакратаром камсамола. Але некаторыя мае сябры ня разумеюць, навошта мне гэта. Напрыклад, Сяржук падышоў ды пытае:

-- Ты што дурань, ці увогуле - камсамолец ?

Але я на гэткіх ня крыўдую. Я яму адказаў адразу :

-- Адвалі, а то яшчэ і ў партыю ўступлю.

І была б чаго, асабіста, крыўдзіцца. Мой старэйшы брат, міліцыянер - ён таксама з дзяцінства працаваць не любіў - кажа, што ўсё роўна хутка гэткіх, як Сяржук, ўсіх пасадзяць. Хутчэй бы ...

АБ НЕАБХОДНАСЬЦІ СУАДНОСІЦЬ РЭАЛЬНАЕ СТАНОВІШЧА З ТАНАЛЬНАСЬЦЮ ПРАМОВЫ.

Апошнія прамовы Зянона Пазьняка сьведчаць пра тое, што ўсёж лідэры БНФ зьвяртаюць увагу на крытыку з боку нефармальнае моладзі. Безумоўна, Зянон Станіслававіч заўсёды быў добрым прамоўцам. але, апошнія яго выступленьні выклікаюць асабліваеь задавальненьне. У йіх адчуваецца здаровы антыкамунізм.

Але праходзіць той час, калі БНФ быў адзінай альтэрнатыўнай сілай кансерватыўнаму карумпіраванаму рэжыму зь яго асновай - Камуністычнай партыяй. Пакрыху перабудова і ў нас кранаецца з мёртвай кропкі. Зьявілася на сьвет новае, шырока разрэклямаванае ў камсамольскім друку, аб'яднаньне - "Дэмакратычная згода". Яно і па форме, і па сутнасьці сваёй сацыял-дэмакратычнага напрамку. 24-25 сакавіка ўМенску прайшла кан-

ферэнцыя беларускIх прыхIльнIкаў "Дэмакратычнае платформы ў КПСС". Створана партыя нацыянальна-дэмакратычнага кIрунку.

ЛагIчным працягам гэнага працэсу зьяўляецца неабходнасьць згуртаваньня ўсIх сIлаў, маючых немарксIсткI ды агульнадэмакратычны падмурак. Самы лепшы варыянт – стварэньне Дэмакратычнае партыI.

Фронт павIнен быць аб'яднаньнем ўсIх партыяў (акрамя камунIстычнае, бо па сутнасьцI ён антыкамунIстычны): Сацыял-дэмакратычнае, Дэмакратычнае, лIберальнае, Нацыянал-Дэмакратычнае I Iньш.

Кожная партыя выражае I абараняе Iнтарэсы пэўнае катэгорыI насельнIцтва. Чым больш партыяў уваходзIць у Фронт – тым шырэй яго сацыяльная база, мацней падтрымка народам, а, значыць, мацней аўтарытэт I уплыў у жыцьцI грамадства. Народны фронт – выдатная глеба дзеля утварэньня розных плыняў. МIж тым, стварэньне партыяў на аснове фронту дазволIць ператварыць яго з аморфнае ў стройную структуIраваную, пагэтаму I больш эфектыўную арганIзацыю.

КIраўнIцтва фронту павIнна быць больш гнуткIм, яно павIнна шукаць тое агульнае, што аб'ядноувае ўсе дэмакратычныя напрамкI. Пагэтаму зараз прамовы Пазьняка – гэта прамовы лIдэра якой-сьцI, пакуль яшчэ ня створанай, партыI. I нIяк не прамовы лIдэра Народнага фронту. Высновальна, альбо трэба зьмянIць танальнасьць на меньш радыкальную, альбо стварыць Беларускую Дэмакратычную Партыю. Але апошняе лепей.

Зялён Хмызьняк

ЕСТЬ АЛЬТЕРНАТИВА!

Читаешь, и прям слеза умиления наворачивается на глазах. Спасибо тебе, родная. Это & надо! Акто б мог подумать? Нет, никогда б не подумал, что ты способна на такую заботу обо мне, да и обо всех нас. Сами посудите: "Высшей целью экономической стратегии КПСС был и остаётся неуклонный подъём материального благосостояния и культурного уровня народа." После таких слов прямо- таки жить хочется

Но, товарищи, надо признать, как это не горько, и чего бы это нам не стоило, что всегда экономическая политика партии была ошибочной. Да-да. Именно. Тут и доказывать ничего не надо.

Отчаиваться однако не стоит. Так как выход есть. Существует всегда правильный выход, в большинстве случаев один. Надо только книжки читать. Там иногда случаются умные сравнительно мысли. И, причём, совершенно никому не известные. Хотя, настолько они бывают гениальны! Ровно настолько, насколько они просты. То есть просты, но гениальны. То есть понятны простому смертному.

И вот с такой простой, но гениальной мыслью, позволяющей, при её реализации, в кратчайший срок вывести страну из тупика и построить коммунизм, я и столкнулся. И, претендуя на лавры первооткрывателя, дарю её Вам, вот она: "В создании материально-технической базы коммунизма значительная роль принадлежит лесопильно-деревообрабатывающему производству"

Эврика! Вот откуда наши беды: от невнимательного отношения к лесопильно-деревообрабатывающему производству! Как всё просто и гениально! Да развивай лесопильно-деревообрабатывающее производство в надлежащей степени, мы уже давно построили бы коммунизм! И никому никакая перестройка не пришла бы в голову! Товарищи! Пусть наше дубовое руководство не подсовывает нам липу! Перестройке есть альтернатива! Да здравствует лесопильно-деревообрабатывающее производство!

И. Дубина-Низмов

НАШ АДРАС : 220018, Менск-18, абанементная скрыня 155, "ПозIрк".

Галоўны рэдактар – Андрусь Дылюк.

"ПозIрк" – незалежная газэта, органам БНФ цI якой-сьцI партыI не зьяўляецца.

" ПРЭЗІДЭНТ "

Якая, шаноўны, Вандэя?
Вярхоўны саўгас Дземянцея
Трасянкаю мовіць Дзяменці.
Шкада, што ён косы не меніціць.
Уладу ад Проні да Бугу
Трымае ў руках ён, як пугу.
Штампуе паперы аб фронце.
Пастух. а кумекае ў "фрондзе".
Відаць, што сягнуў на пасты.
Быкам падкруціўшы хвісты.
Нашто Дземянцею пагоня?
"В совхозе есть лучшие кони".
Навошта мой сьцяг зіхаціць,
Калі Дземянцей - "не хотить"?!
Не ўшчуць Дземянцея, хоць трэсьні:
Не чуў ён Максімавай песьні.
...Чарнобыля чорныя здані
Сабой засланілі папаньні,
І вось ў такую часіну
Народу і цела і дух,
Крывіцкую Маці-Краіну
Няужо уратуе пастух?

Павел Марціновіч

АФАРЫЗМЫ-ЭЙФАРЫЗМЫ-АФЕРЫЗМЫ ::::::


Калі праца не воўк - работнік ў лес не ўцячэ.
Кліент заўсёды правы, але не заўседы можа гэта даказаць.
Памяць - не бяздонная бочка, памяць - гэта рэшата.
Хацеў скочыць вышэй асабістай галавы ды зьбіў яе сваім задам.
Рада жадаючым пахудзець : харчуйцеся выключна ў кааператыўным кафэ.
Чалавек шукае дзе лепей, а рыба, калі яшчэ і здольна што-небудзь шукаць - дык гэта месца ў Чырвонай кнізе.
Калі квітнее шэрасьць, цьмяную асобу ільга ўспрыняць як яркую.
Часта людзі не першарваюць адзін аднаго толькі таму, што ў галаве не варыць.
Дарованому каню ўзубы не глядзяць, нават калі гэты конь - траянскі.

Цохай-Ліпскі

Не варта замыкацца ў сабе. Замыканьні часта становяцца прычынаю пажару.
Страціў галаву таму, што ні было чаго больш страчваць.
Павярнуўся тварам да народу , і яго апазналі.

В.Сьвістун

НАША РЕКЛАМА



КОНСТИТУЦИЯ СССР–САМАЯ ДЕШЕВАЯ В МИРЕ!

Дерьмократический централизм
Коммунизменный инстинкт
Мраксизм
Нарядный депутат СССР
Социальное страховоние

Антык Омунист

КУТОК АБЫВАЦЕЛЯ

-Ну у тебя и друзья: так и норовят в гости придти.

" " "

-Дорогой, у тебя сегодня такое одухотворённое лицо !
- Прости, дорогая,- я выпил твои духи.

" " "

-Вчера я пытался самостоятельно исправить неполадку в телевизоре,и, ты знаешь, меня сильно потрясло...
-Что же ты увидел ?
-Нет. меня потрясло, когда я дотронулся до какого-то провода.

М. Гмах

-У Вас вельмі шмат пластовак з класічнай музыкай. Вы, мабыць, вялікі аматар ?
-Ну што Вы. Проста мае жонка іцешча яе цярпець ня могуць.

В. Д.